ваць орган РК КПБ, выліць на яго лыжку дзёгцю. Але ж гэта Вы самі льеце той самы дзёгаць, прабачце, на галовы сваіх супрацоўнікаў квартамі. Вы, думаю, добра памятаеце ўласны сакавіцкі артыкул "Чаго хочуць нефармалы?", у якім у лепшых застойных традыцыях абілілі брудам тых, хто выступіў у абарону нашага ж супрацоўніка Уладзімера Шушковіча, адразу зрабіўшы іх дрэннымі працаўнікамі. Адзін з "абаронцаў", начальнік аграхімаддзела райсельгасхіміі Пётра Місьнік быў вымушаны звольніцца з працы.

Калі я запатрабаваў зьмясьціць у газеце мой ліст у адказ на Ваш артыкул, Вы адказалі, што калі я буду настойваць, дык Вы яшчэ другі зьмесьціце і здалі мой ліст у архіў. Можа думаеце і мая памяць у архіве знаходзіцца? А вось Ваша сумленьне не ў архіве часам? Інакш як зразумець, што Вы даволі часта паўтараеце, што Уладзімера Шушкевіча выключылі з партыі за"памылковасьць поглядаў" /№56 ад 9 траўня 89г./. А я вось чуў ад першага сакратара райкаму партыі, што Уладзімер сам падаў заяву аб выхадзе з кагорты камуністаў. Выбачайце, але і на гэты раз я веру ня Вам. Дык хто ж "падтасоўвае факты?"

Гаворачы аб гістарычнай сымболіцы, факты падтасоўваеце Вы самі. Ніколі ў час вайны паліцаі не насілі бел-чырвона-белыя павязкі на рукавах. Навошта хлусіць? Калі ня ведаеце, то спытайце старых людзей.

Дужа дзіўны артыкул у нумары 103 пад загалоўкам "Мой сказ нефармалам" і за подпісам члена савета ветэранаў вайны і працы Міная Карніенкі, колішняга намесьніка райаддзела міліцыі. Падвялі Вы аўтара пад пень-калоду. Мабыць удвох вы не чытаеце рэспубліканскую прэсу? Бо як можна напісаць аб тым што ужо на той час зьявілялася хлусьнёй рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі. Я маю на ўвазе "Ліст са Смаргоні", а не "Письмо з Прыбалтыкі", і артыкул Дзьмітрыева /"Звязда" ад 14.07.89., іншыя рэспубліканскія газеты, "Віцебскі рабочы"/, у якім аўтар злоўлены, як кажуць, за руку на плагіяце, хлусьні, самазванстве.

Мы ўжо даволі добра ведаем прычыны Чарнобыльскай катастрофы і яе віноўнікаў, тых, хто панёс адказнасьць ці выкруціўся ад яе. Дык навошта ж Вы гэтую страшэнную чорную справу прыпісваеце нефармалам? Глупства! Толькі не радавое — палітычнае.

Вы напэўна ведаеце, як называюць тых, хто хлусіць? Думаю, што ведаеце, як называюць і тых, хто разносіць заведамую хлусьню. Дык можа лепяльчане і сапраўды мелі рацыю, прыпісваючы Вашай асобе такія вобразныя эпітэты.

АНАТОЛЬ ШУНЕВІЧ,
вядучы аграном РАПА
па расьлінаводству.

# У РАЁНЕ

*Стварэньню першай у Лепелі групы падтрымкі БНФ прысьвячаецца.*

Як патрывожаны вулей райкам бушуе.
"Трэба ж такому здарыцца у нас" —
Гаворыць Першы, а Другі мяркуе: —
"Які там дэмакрат сьпяшае час?"
Знайшлі. Вядуць у стары Дом чырвоны
Таго, каму абрыдла за гады
Народа ведаць толькі твар скароны,
Гнутую сьпіну, шэпт цішэй вады.
"Народ ня пойдзе за табой, — гавораць. —
Яму ня трэба мова і лысы.
Сядзі ціхенька. Добры час падораць
Адтуль, дзе не прысьпешваюць часы.
Ты — камуніст! Адкуль жа самадзейнасьць?
Рабіць павінен ты, што скажам мы!
У слоў тваіх праўдзівасьць і надзейнасьць
Ня верым мы, рэспублікі сыны.
Адзіная праблема нас хвалюе:
Як накарміць і апрануць людзей,
Астатнія ж сыты Васіль малюе,
Крывавых хоча нам з табой падзей."
Няўжо ня бачаць дзядзькі ад улады —
Пакуль душа пакутнікаў пустая,
Ня бачыць ім тых парасткай расады,
Што рай нам зробіць — ісьціна простая.

Зламалі! Сьціснулі! Зьнявечылі у праўду!
Не! Не таго, хто хоча звацца Беларусам.
Народ зьнявечыўся, заняў у сэрцы крыўду,
Накрыўся зноў маўклівасьці абрусам.

Лістапад, 1988.

УЛАДЗІМЕР ШУШКЕВІЧ

# ИСПОВЕДЬ

Совесть не беру я на поруки,
Речи не веду издалека.
Я — рабочий! Трудовые руки
В годы переделают века.
Быть могу я в звании профессора,
В ореоле славы и наград.
В горе мать и сын — моя профессия,
Родина в беде и я — солдат.
Не в одних победах мы мужаем,
Не в застолье дружбу познаем.
Мы нуждой отчизну унижаем,
Горе, кривду полной чашей пьем.
От беды не спрячет крыша дома.
Доля наша — вечная борьба.
Боль неправды каждому знакома
Страх, неволя — ноша для раба.
Бой со злом не уличная ссора,
Гибнет Человек, уходит в тьму
Жертва аппаратного террора.
Кто могилу выкопал ему?
Вяжут души сталинские тени,
На законы поднял меч палач.
Наши судьбы ставят на колени
Клеветник, лакей, злодей, стукач.
Не знакомы с благородством каты,
Их дела страшней любой беды.
К памяти взывают Куропаты,
Бьют тревогу менские "Дзяды".
Вызрел в равнодушии и лести
Инквизитор века — бюрократ.
Не имея чести, он бесчестье
Носит как награду, как мандат.
Зло, добро все для него едино,
Сталинизма сила он, оплот.
Повелят — продаст родного сына,
Свой народ взведет на эшафот.
Сапогом Указа — на свободу,
Гласности закрыть пытались рот,
Как Сатурн, он мафии в угоду
Перестройку в колыбели жрет.
И теперь в хмельном угаре власти
Сеет он позора семена,
Обвиняет всех во всех несчастьях.
Только в чем же, наша в чем вина?
В ненависти к чинопочитанию?
В речи той, что научила мать?
В неумении награды брать и звания?
По приказу думать, жить, молчать?
Разуму и сердцу повинуясь,
Смерть приму, как воин на войне.
Заплачу за правду не торгуясь,
За Свободу выложу вдвойне.
Не страшусь я участи Джордано,
Воя черной сотни не боюсь.
Сквозь туманы клеветы, обмана
Возрожденной вижу Беларусь.
Я в народ свой верю гордый, смелый,
Знаю, будет жизнь его иной.
Пусть витает счастье стаей белой
Над моей измученной страной!

Б. ГОРСКИЙ 10.03.89.
ЛЕПЕЛЬ

# АКТЫЎНАЯ СЬВІНІНА

Прачытаўшы нядаўна ў прэсе паведамленьні аб радыёактыўных прадуктах зь Беларусі, загадчык аддзяленьня санчасьці аўтамабільнага завода імя Ліхачова Алег Мельнік вырашыў праверыць на радыёактыўнасьць кансервы з прадуктовага"заказу", атрыманага на мінулым тыдні.

— Вынікі атрымаліся непрыемныя, — расказвае лекар. — Мы праверылі бляшанкі з "Завтраком туриста", у закрытым выглядзе яны давалі звычайны фон. Але ў адкрытым!... "Бета"-выпраменьваньне перавы-

